■ Вакол арэн

# НЕ КВАСАМ АДЗІНЫМ

## У ЛІДЗЕ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ЎСЁ БОЛЬШ БУЙНЫХ СПАРТЫЎНЫХ АБ'ЕКТАЎ



**ГЭТЫ горад у заходняй частцы краіны заўсёды славіўся сваёй гісторыяй, архітэктурнымі будынкамі, якія захаваліся з мінулых стагоддзяў, і маштабнымі прадпрыемствамі, а асацыяваўся ў многіх з квасам і кедамі. Апошнім часам усё часцей можна чуць яшчэ і пра Ліду спартыўную. Літаральна днямі там прайшоў буйны міжнародны турнір па грэка-рымскай барацьбе імя Валерыя Цыленця і спаборніцтвы дзюдаістаў памяці Віктара Юртава, якія сабралі каля 300 спартсменаў, у тым ліку і замежных. На красавік прызначаны яшчэ адзін буйны турнір — па валейболе.**

### Праца 14 гадзін на суткі

Усе гэтыя мерапрыемствы прыняў і яшчэ будзе прымаць спартыўна-аздараўленчы комплекс «Алімпія», які за свае няпоўныя 6 гадоў стаў адным з улюбёных месцаў жыхароў Ліды. Будаўніцтва аб'екта пачалося ў 2010-м, а ўжо праз год спартыўны цэнтр адкрыў свае дзверы. У ім размясцілася дзіцяча-юнацкая спартыўная школа № 1, якая ажыццяўляе падрыхтоўку рэзерву па валейболе, баскетболе і гандболе. Цяпер у школе вучыцца каля 400 хлопцаў і дзяўчат, рэгулярна выхаванцы трапляюць у склад зборных камандаў вобласці, перамагаюць на рэспубліканскіх і міжнародных спаборніцтвах.

Сам комплекс уключае ў сябе басейн, універсальную спартыўную залу, трэнажорную і залу для барацьбы. «Алімпія» працуе ўвесь год, выключэнне не складаюць выхадныя і нават святочныя дні — звычайна гэта 14 гадзін на суткі. Наведваць спартыўны цэнтр могуць не толькі выхаванцы школы, але і ўсе аматары актыўнага адпачынку.

— Мы прапануем шэраг платных паслуг, якімі могуць скарыстацца ўсе жыхары Ліды, — расказвае **дырэктар «Алімпіі» Ігар САЎРАС.** — Калі ўніверсальная і барцоўская залы ў асноўным выкарыстоўваюцца для трэніровак і збораў прафесійных спартсменаў, то басейн і трэнажорная зала большую частку часу ў распараджэнні гараджан. Часта абанементы закупляюць прадпрыемствы для сваіх работнікаў, так што наш аб'ект загружаны заўсёды, — адзначае Ігар Канстанцінавіч.

Ён удакладняе, што гэта і складае асноўную частку пазабюджэтнай дзейнасці. Акрамя таго, многія расійскія спартыўныя клубы выбіраюць лідскі спарткомплекс для правядзення збораў, што таксама дапамагае аб'екту выжываць у не самыя простыя часы.

— Вядома, выйсці на самаакупнасць немаверна складана, але сёння мы можам пакрываць 15—20% бюджэтных выдаткаў. Перш за ўсё трацім заробленыя грошы на дзяцей, забяспечваем ім удзел у розных спаборніцтвах. Калі дазваляюць сродкі, то імкнёмся ўмацоўваць матэрыяльна-тэхнічную базу комплексу, павышаем заработную плату нашым супрацоўнікам, — расказвае Ігар Саўрас.

Трэба адзначыць, што комплекс прыстасаваны і для гараджан з абмежаванымі магчымасцямі. Напрыклад, у басейне ёсць спецыяльнае крэсла для спуску ў ваду і спецыяльны выхад на дарожку, у гульнявой зале выдзелены глядацкія месцы для размяшчэння інвалідных калясак, у раздзявальнях прадугледжаны спецыяльныя месцы для пераапранання і наведвання душавых.

Вядома, не абыходзіцца «Алімпія» і без відовішчаў. Тут базіруецца наймацнейшы ў краіне міні-футбольны клуб — «Лідсельмаш», неаднаразовы чэмпіён Беларусі рэгулярна збірае на сваіх трыбунах не адну сотню аматараў футбола.

Аднак спыняцца на дасягнутым — значыць страціць усе былыя заваяванні, таму Ігар Канстанцінавіч адзначае, што самае галоўнае ў далейшым развівацца, захаваць школу і працягваць яе спартыўныя традыцыі.

### Хакей дзецям у радасць

За некалькі дзясяткаў метраў ад «Алімпіі», прыкладна ў аднолькавы час з комплексам, з'явіўся ў Лідзе і Лядовы палац. Гэта мясцовая мека хакея, тут усе акцэнты зрушаны менавіта да гэтага віду спорту.

Дзіцяча-юнацкая спартыўная школа, якая працуе на базе Лядовага, месціць сёння каля 300 вучняў — гэта 27 хакейных груп. Выхаванцы першых набораў ужо падбіраюцца да юнацкага ўзросту і пачынаюць паказваць годныя вынікі, звяртаючы на сябе ўвагу спецыялістаў са сталіцы.

— Школа ў нас маладая, а рост і прагрэс ужо прыкметныя, — адзначае **намеснік дырэктара Мікалай ТАРАБРЫН.** — Гэтаму спрыяе добры падбор спецыялістаў, у нас працуюць падрыхтаваныя, адукаваныя трэнеры.

Абсалютная большасць з іх — гэта прыезджыя, добрыя ўмовы і дастойная заработная плата дазваляюць настаўнікам надоўга затрымлівацца ў горадзе. Былы гулец сталічнага «Кераміна» Дзяніс Ламека набіраў адну з першых груп маленькіх хакеістаў у Лідзе, а сёння ўжо расказвае пра поспехі сваіх выхаванцаў.

— Я тут ужо 6 гадоў, таму можна сказаць, што ўсе змены адбываліся на маіх вачах. За гэты час з'явілася шмат таленавітых дзяцей, якімі сёння цікавяцца самыя моцныя школы нашай краіны — «Юнацтва», «Дынама», а таксама клубы з Расіі. Цікавасць да хакея ў Лідзе вялікая і, як не дзіўна, яна не знікае з часам. На трэніроўкі прывозяць дзяцей не толькі з самога горада, але і з навакольных раёнаў. У мяне ёсць хакеісты з Дзітвы, Воранава, гэта 10—30 км ад Ліды, — адзначае Дзяніс Паўлавіч.


Юнацкі чэмпіянат Еўропы па сумо.

Усе заняткі праходзяць на бясплатнай аснове, нават выдаткі на экіпіроўку і інвентар часткова спрабуе пакрываць сама ДЮСШ.

— Мы можам зарабляць нейкія грошы на паслугах, якія прапануе Лядовы палац, гэта ў асноўным масавае катанне, більярд, арэнда саўны. Таксама ёсць магчымасць праводзіць канцэрты зорак нашай і расійскай эстрады. За кошт гэтага спрабуем дапамагаць дзіцячым групам, каб ад бацькоў патрабавалася як мага менш укладанняў, — расказвае Мікалай Тарабрын. — Наша галоўная задача — выхаваць усебакова развітых асоб, добрых людзей, а ці стануць яны прафесійнымі хакеістамі, шмат у чым залежыць ад іх саміх.

Кіраўніцтва школы адзначае, што сёння ўжо паўстае пытанне пра недахоп лёду, з кожным годам ён становіцца ўсё больш запатрабаваны. Акрамя дзіцячых камандаў, Лядовы палац з'яўляецца домам для прафесійнай каманды — ХК «Ліда», якая выступае ў экстралізе чэмпіянату Беларусі. Гульні з топ-клубамі, асабліва калі яны прызначаны на выхадныя, збіраюць каля 800 гледачоў (агульная ўмяшчальнасць арэны — 1100 месцаў), што з'яўляецца ня дрэнным паказчыкам для чэмпіянату Беларусі.

Акрамя гэтага, у Лідзе яшчэ 5 спартыўных школ, новае футбольнае поле са штучным пакрыццём і ня дрэнны футбольны стадыён, усё гэта робіць горад не толькі індустрыяльным, але і спартыўным ■


Міжнародны турнір па валейболе.

■ Падзея

## На схіле будзе снег!

**Сёння ў Раўбічах праходзіць этап Кубка свету па фрыстайле**

**Яшчэ да старту спаборніцтваў было абвешчана, што турнір пройдзе пры любым надвор'і. Бок, які прымае спаборніцтвы, падрыхтаваў трасу належным чынам, гэта пацвердзілі спецыялісты. Афіцыйны прадстаўнік Міжнароднай федэрацыі лыжнага спорту Райнхард Крампфл заявіў, што ніякіх нараканняў няма ні ад арганізацыйнага камітэта ні ад трэнераў замежных зборных.**

У гэтым годзе ў Раўбічах сабраўся як ніколі моцны склад фрыстайлістаў, у спаборніцтвах прымаюць удзел спартсмены з 12 краін: Аўстраліі, Беларусі, Вялікабрытаніі, Германіі, Казахстана, Канады, Кітая, Расіі, ЗША, Украіны, Швейцарыі і Японіі.

*— На жаль, хутчэй за ўсё, у спаборніцтвах не зможа прыняць удзел Антон Кушнір, —* заявіў напярэдадні **галоўны трэнер нашай зборнай Мікалай Казека.** *— Ён цяпер праходзіць медыцынскае паглыбленае абследаванне. Усё ж такі два гады перапынку адбіліся на яго стане падчас выступленняў у гэтым сезоне. Таму прынялі рашэнне даць Антону магчымасць абследавацца, мне здаецца, гэта правільна. Самае галоўнае цяпер, што Антон вярнуўся да актыўных выступленняў.*

Беларусь на этапе Кубка свету прадстаўляюць: Максім Гусцік, Станіслаў Гладчанка, Арцём Башлакоў, Дзмітрый Мазуркевіч, Павел Дзік, Ілья Гарэлік, Аляксандра Раманоўская, Ганна Рослік і Вера Ляшкевіч. Таксама ў «Раўбічах» выступаць лідары сусветнай лыжнай акрабатыкі, сярод якіх амерыканцы Эшлі Колдуэл, Кілія МакКінан, Мак Боханан і Алекс Боўэн, канадзец Трэвіс Герыц, прадстаўнікі Кітая Ці Гуангпу, Ксю Ментаа, Ліу Жанкін.

Нагадаем, што па суме пяці этапаў Кубка свету сезона — 16/17 у лыжнай акрабатыцы тры беларускія фрыстайлісты ўваходзяць у дзясятку найлепшых. Антон Кушнір, дзякуючы тром перамогам, размяшчаецца на другім месцы, на чацвёртай пазіцыі знаходзіцца Максім Гусцік, шосты радок за Станіславам Гладчанкам ■

# ЗАДАЦЬ ДОБРЫ ТЭМП

## Баскетбалісткі нацыянальнай зборнай працягваюць першы ў гэтым годзе трэніровачны збор

**Заняткі каманды будуць доўжыцца да 28 лютага. У трэнерскі штаб акрамя галоўнага настаўніка Наталлі Трафімавай і яе памочніка Аляксея Пынцікава ў гэтым сезоне ўваходзіць вядомы ў мінулым беларускі біятланіст Вадзім Сашурын, які адказвае за агульнафізічную падрыхтоўку спартсменак.**



— Пакуль я задаволеная той рабочай атмасферай, якая склалася ў калектыве. Усе дзяўчаты працуюць з поўнай самааддачай, і гэта не можа не радаваць. Трэнерскі штаб, у сваю чаргу, стараецца разнастаіць трэніровачны працэс, зрабіць яго максімальна насычаным і цікавым. Робім акцэнт на тым, каб звыклая манатонная і цяжкая агульная фізічная падрыхтоўка праходзіла не толькі інтэнсіўна, але і ўключала ў сябе шмат новых развіваючых практыкаванняў. Такія зборы, перш за ўсё, добрая магчымасць для маладых гульцоў вывучыць свой арганізм як мага лепш, зразумець, над чым працаваць і да чаго імкнуцца, — пракаментавала Наталля Трафімава.

Нагадаем, што сёлета нашы баскетбалісткі будуць выступаць на чэмпіянаце Еўропы, які пройдзе з 16 па 25 чэрвеня ў Чэхіі. На першым этапе спаборніцтваў беларускі згуляюць у групе B разам з камандамі Італіі, Славакіі і Турцыі.

У трэніровачным лагеры ў Раўбічах знаходзіцца 14 спартсменак: Кацярына Рыбалка, Аляксандра Шаўчэнка, Анастасія Сушчык, Ганна Лапо, Яўгенія Сцяпанава, Вікторыя Гаспер (усе — «Цмокі-Мінск»); Марыя Адашчык, Ганна Брыч, Юлія Рыцікава (усе — «Гарызонт», Мінск); Святлана Кудрашова, Наталля Дашкевіч, Арына Масько, Алёна Голубева (усе — «Алімпія», Гродна); Наталля Гарбачова («Вікторыя», Гродна).